## Білет 18

**Практычнае заданне.**
**Культура Беларусі ў XIX–пачатку XX ст. Умовы і асаблівасці фарміравання беларускай нацыі.**

**Выкарыстоўваючы прадстаўленыя матэрыялы, адкажыце на пытанні (выканайце заданні):**
1. У якіх гарадах Беларусі ў другой палове XIX - пачатку XX ст. можна было атрымаць педагагічную адукацыю? Назавіце і пакажыце на карце не менш за тры.
2. Якім чынам студэнты-гоманаўцы абгрунтоўвалі існаванне беларускай нацыі?
3. Якія прыкметы беларускай нацыі даследавалі вучоныя ў другой палове XIX – пачатку XX ст.?
4. Падбярыце цытаты з прыведзеных матэрыялаў, якія пацвярджаюць фарміраванне ў другой палове XIX ст. нацыянальнай самасвядомасці беларусаў.

**I. Установы адукацыі на тэрыторыі Беларусі ў другой палове XIX - пачатку XX ст.**




**II. Аб фарміраванні беларускай нацыі** *(па матэрыялах вучэбнага дапаможніка "Гісторыя Беларусі. Канец XVIII - пачатак XX ст. 8 клас»)*

Нацыя – гэта гістарычная супольнасць людзей, для якой характэрны пражыванне на адной тэрыторыі, агульнасць гаспадарчага жыцця, агульныя мова, рысы культуры і псіхалогіі, нацыянальная самасвядомасць, імкненне да ўласнай дзяржаўнасці. Нацыянальная самасвядомасць - сукупнасць ідэй, перакананняў, ведаў, пачуццяў, у якіх народ усведамляе сябе як нацыю.

Тэарэтычнае абгрунтаванне самастойнага існавання беларускай нацыі ўпершыню далі беларускія студэнты-гаманаўцы. У 1884 годзе студэнты-ўраджэнцы Беларусі стварылі ў Пецярбургу групу «Го́ман». Яе ўзначалілі Аляксандр Марчанка

і Хаім Ратнер. Свае задачы і праграму яны выклалі ў двух нумарах нелегальнага часопіса “Гомон”. Гаманаўцы першымі з рэвалюцыянераў заявілі аб існаванні беларускай нацыі і паставілі пытанне аб яе нацыянальна-дзяржаўнай самастойнасці. Яны даказвалі, што беларускі народ мае сваю мову, тэрыторыю, культуру, побыт, гістарычнае мінулае, а Беларусь уяўляе сабой цэласны эканамічны рэгіён. Будучую дзяржаўнасць Беларусі гаманаўцы бачылі ў саюзе з сацыялістычнай Расіяй. Яны выступалі за аўтаномію Беларусі ў складзе дэмакратычнай і федэратыўнай Расіі.

Аб фарміраванні нацыянальнай самасвядомасці сведчылі адносіны жыхароў Беларусі да мовы. Паводле перапісу 1897 г. беларускую мову прызналі роднай 60% настаўнікаў, 40% чыноўнікаў, 29% паштова-тэлеграфных служачых, 20% работнікаў медыцынскіх устаноў.

Формай праявы нацыянальнай самасвядомасці з'яўляецца назва народа. У канцы XIX - пачатку XX ст. частка насельніцтва Беларусі называла сябе "тутэйшыя". У некаторых мясцовасцях існавалі рэгіянальныя назвы: «палешукі», «пінчукі», «тураўцы». Перапіс 1897г. сведчыў, што большасць жыхароў Беларусі ўжо засвоілі назву «беларусы» і прытрымліваліся яе. Тэрмін "Беларусь" і назва "беларусы" паступова замацаваліся за ўсёй тэрыторыяй пражывання нашага народа.

**ІІІ. Навуковыя даследаванні пра мову, этнаграфію беларусаў, гісторыю Беларусі** *(па матэрыялах вучэбнага дапаможніка “Гісторыя Беларусі. Канец XVIII - пачатак XX ст. 8 клас»)*

Адным з першых буйных даследчыкаў Беларусі быў мовазнаўца і этнограф Іван Насовіч. Асноўнай яго працай стаў выпушчаны ў 1870 г. «Словарь белорусского наречия». У гэтым выданні змяшчаецца больш за 30 тыс. слоў, кожнае з іх грунтоўна тлумачыцца. Слоўнік І. Насовіча не страціў сваёй каштоўнасці і зараз, бо ў ім зафіксаваны словы, якія ўжо зніклі.

Заснавальнік беларускага навуковага мовазнаўства і літаратуразнаўства Яўхім Карскі першым сярод беларусаў атрымаў званне акадэміка Расійскай Акадэміі навук. Сусветную вядомасць вучонаму прынесла трохтомнае выданне «Беларусы» (1903—1922). Я. Карскі паказаў самастойнасць беларускай мовы ў сям'і іншых славянскіх моў, вызначыў тэрытарыяльныя межы яе распаўсюджвання; навукова абгрунтаваў нацыянальную самабытнасць беларусаў як самастойнага славянскага народа.

У другой палове 1880-х гг. з ідэяй аб самабытнасці беларускага этнасу і яго праве на самастойную палітычную будучыню выступіў гісторык, ураджэнец Рэчыцы Мітрафан Доўнар-Запольскі. Ён займаўся вывучэннем нацыянальнай і культурнай самабытнасці беларускага народа. Выдаваў зборнікі архіўных дакументаў, якія змяшчалі раней не апублікаваныя, не вядомыя даследчыкам першакрыніцы па гісторыі Беларусі XIV-XVIII стст.